# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА
# ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

## 11 клас
## Варыянт 1

**Заданне 1.** Пазнайце слова па яго лексічным значэнні і вызначце яго родавую прыналежнасць. Адказы запішыце ў адпаведных слупках табліцы.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

*Узор:*

| Слова | Лексічнае значэнне | м. р. / ж. р. |
|---|---|---|
| **запіс** | *Пісьмовая перадача, змест чаго-н.; запісаныя на паперы думкі, заўвагі і пад.* | *м. р.* |

*Словы для даведкі:* бездараж, брыль, гаць, рукапіс, цемрадзь, шынель.

| Слова | Лексічнае значэнне | м. р. / ж. р. |
|---|---|---|
| | Артылерыйскі снарад, начынены круглымі кулямі, буйны шрот | |
| | Шматгадовая травяністая расліна з жоўтымі кветкамі, якая расце на балотах, берагах сажалак | |
| | Травастой; месца, дзе расце трава на сена; луг | |
| | Адзінка меры даўжыні, якая ўжывалася да ўвядзення метрычнай сістэмы мер | |
| | Лік, які складаецца з пэўнай колькасці роўных частак адзінкі | |
| | Шматгадовая травяністая расліна з буйнымі рассечанымі або складанымі лістамі, якая расце ў цяністых вільготных месцах | |

**Заданне 2.** Слова можа мець адзін, два, тры і больш суфіксаў. Можа мець нулявы (матэрыяльна не выражаны) суфікс. А можа не мець суфіксаў зусім. Размяркуйце наступныя словы па асобных слупках табліцы. У кожным з прапанаваных слоў вызначце суфікс (суфіксы).

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

Дуброва, аб’езд, абазвац, лаўлю, абоі, адразу, (паехаць) вечарам, буралом, вясенні, вазон, зноў, даўгагрывы.

| Словы без суфікса | Словы з нулявым суфіксам | Словы з адным матэрыяльна выражаным суфіксам | Словы з двума матэрыяльна выражанымі суфіксамі |
|---|---|---|---|
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |

**Заданне 3.** Падбярыце да шасці з сямі слоў, пададзеных у табліцы, такія словы з наступнага абзаца, каб ад асноў кожнай пары можна было ўтварыць неаказіянальныя складаныя назоўнікі або прыметнікі (г. зн. яны павінны змяшчацца ў нарматыўных слоўніках літаратурнай мовы). Упішыце па шэсць падабраных і ўтвораных слоў у адпаведныя ячэйкі табліцы. Насупраць незапатрабаванага слова пастаўце ў другім і трэцім слупках прочырк.

*Зямля, маскіраваць, пісаць, праходзіць, утварыць, час.*

**Заўвага:** аснова слова з першага слупка павінна ў складаным слове ісці першай, а ў другім слупку ніводнае слова не павінна паўтарацца.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

*Узор:*

| | | |
|---|---|---|
| *Кніга* | *Друкаваць* | *кнігадрукаванне* |

| | | |
|---|---|---|
| *зямля* | | |
| *ікона* | | |
| *новы* | | |
| *свет* | | |
| *святло* | | |
| *той* | | |
| *чорны* | | |

**Заданне 4.** Вывучэнне геаграфіі Беларусі ўключае ў сябе апісанне разнастайных прыродных кампанентаў і рэсурсаў. Раскрыйце дужкі і размясціце назвы геаграфічных паняццяў у адпаведных слупках табліцы.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

(азёрна)ледавіковая слаістая гліна
(вулканагенна)асадкавая тоўшча
(Заходне)Еўрапейская платформа
(каменна)вугальныя адклады
(мелка)водны марскі басейн
(геа)структурныя элементы

| **Злітнае напісанне** | **Напісанне праз дэфіс** |
|---|---|
| | |
| | |
| | |
| | |

**Заданне 5.** У заданні ўсе прыклады згрупаваны па пэўнай граматычнай прымеце. Але ў кожнай групе ёсць лішні прыклад. Знайдзіце і запішыце яго нумар у адпаведным слупку. Патлумачце свой выбар.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

*Узор:*

| **Прыклады** | **Трэцяе лішняе (нумар)** | **Тлумачэнне** |
|---|---|---|
| *I. Від сувязі паміж словамі ў словазлучэнні:*<br>1) вясёлыя канікулы;<br>2) вывучыць верш;<br>3) мая кніга. | 2 | 1 і 3 – дапасаванне;<br>2 – кіраванне. |

| Ілюстрацыйны матэрыял | Трэцяе лішняе (нумар) | Тлумачэнне |
|---|---|---|
| *I. Простыя і складаныя сказы:*<br>1) Сяргей стаяў пад бярозамі і любаваўся гэтымі знаёмымі, але сёння чамусьці асабліва ўрачыстымі і светлымі мясцінамі і ўсміхаўся сам сабе (А. Вaraновіч).<br>2) У Карэліцкім раёне, што на Гродзеншчыне, геолагі знайшлі жалезную руду (М. Шыманскі).<br>3) Насустрач хмары паплылі, і стала ўраз цямней (А. Бачыла). | | |
| *II. Від складанага сказа:*<br>1) Мне было сцюдзёна пасля хваробы, аднак я пайшоў, і хадзіў доўга, і на хваробу сваю забыўся (М. Гарэцкі).<br>2) Хоць не было спякоты, але так і вабіла пад засень дрэў, каб пасядзець там хвіліну-другую (У. Шахавец).<br>3) Я вярнуўся сюды, дзе праводзіла ў свет мяне маці, дзе я першую радасць і смутак маленства пазнаў (Р. Няхай). | | |
| *III. Від дадан ай часткі:*<br>1) Каб перайсці цераз ручай, мне давялося зламаць на падпорку даволі тоўстую, але зусім сухую асінку (У. Караткевіч).<br>2) Параіўшыся, [Алесь] прыняў рашэнне, каб у капанні катлавана дапамог і тол (П. Броўка).<br>3) Кожны з нас прыпасае Радзімы куток, каб да старасці чэрпаць адтуль успаміны… (П. Панчанка). | | |
| *IV. Сінтаксічная функцыя злучальнага слова:*<br>1) Я не ведаю, з чым зраўняецца радасць дотыку да зямлі (П. Макаль).<br>2) На тэрыторыі Беларусі пашыраны разьба па дрэве і разьба па косці, апошняя з якіх вядома з часоў позняга палеаліту (Я. Сахута).<br>3) На Беларусі існавала шмат спосабаў, магічных прыёмаў якімі карысталіся сяляне пры выбары месца пад хату (Л. Лыч). | | |

**Заданне 6.** Абапіраючыся на прыведзеныя ў левым слупку табліцы дзеясловы, складзіце шэсць фразеалагізмаў. Для гэтага выкарыстайце прапанаваныя ў наступным абзацы словы, ужываючы іх у форме патрэбнага склону і ліку. Запішыце складзеныя фразеалагізмы ў правым слупку насупраць адпаведных ім значэнняў.

Словы-кампаненты для складання фразеалагізмаў: *агульны, голас, да, з, ікона, на, назоўнік, палец, паміж, пан, пераплёт, у, хоць, чужы.*

**Заўвага:** адзін з дзеясловаў павінен быць ужыты не ў форме інфінітыва.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | | |
|---|---|---|
| *захварэць* | ‘пачаць весці сябе высакамерна, фанабэрыста, выяўляючы нечаканыя звычкі, імкненне да раскошы і пад.’ | |
| *трапляць* | ‘аказвацца ў цяжкім, небяспечным ці непрыемным становішчы’ | |
| *пісаць* | ‘хто-н. вельмі добры ва ўсіх адносінах’ | |
| *прапускаць* | ‘знарок не звяртаць увагі на што-н., не надаваць значэння чаму-н.’ | |
| *прыводзіць* | ‘ліквідуючы адрозненні, ураўноўваць што-н. у якіх-н. адносінах’ | |
| *спяваць* | ‘не маючы ўласных перакананняў, выконваць чужую волю, паўтараючы раней сказанае іншымі’ | |

**Заданне 7.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

Вошел молодой человек лет двадцати пяти, блещущий здоровьем, с смеющимися щеками, губами и глазами. Зависть брала смотреть на него. Он был причесан и одет безукоризненно, ослеплял свежестью лица, белья, перчаток и фрака. По жилету лежала изящная цепочка, с множеством мельчайших брелоков. Он вынул тончайший батистовый платок, вдохнул ароматы Востока, потом небрежно провел им по лицу, по глянцевитой шляпе и обмакнул лакированные сапоги. *(По И. Гончарову.)*

**Заданне 8.** Уважліва прачытайце прапанаваны ўрывак з твора Янкі Купалы “Магіла льва” і пагадзіцеся ці не пагадзіцеся з прапанаванымі сцверджаннямі, паставіўшы + (“плюс”) у адпаведным слупку.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

Абведзен быў высокім мурам
Палац, як той астрог, кругом.
Сталетні ліпы ўкруг панура
Стагналі ночаю і днём.

Баярын тамка жыў багаты,
Яшчэ лятамі малады,
Да сваявольства быў заўзяты,
Па-свойму час губляў з нуды.

Усюды броіў самазбродам,
Тварыў закон свой і свой суд
Над абнядоленым народам,
Што збыць не меў сіл сваіх пут.

| № п.п. | Сцверджанні | Так | Не |
|---|---|---|---|
| 1 | Гэта ўзор сентыменталізму | | |
| 2 | Гэта твор у межах напрамку барока | | |
| 3 | Паэма напісана 4-стопным харэем | | |
| 4 | Паэма напісана 5-стопным ямбам | | |
| 5 | Ва ўрыўку ёсць парушэнні вершаванага памеру (стопы, якія не маюць націску) | | |
| 6 | У фрагменце выкарыстаны толькі мужчынскія рыфмы | | |
| 7 | У фрагменце выкарыстаны толькі жаночыя рыфмы | | |
| 8 | У фрагменце адсутнічае рыфмоўка | | |
| 9 | Асаблівасцю гэтага ўрыўка з’яўляецца выкарыстанне анафары | | |
| 10 | У апошняй страфе ўрыўка выкарыстаны эпітэт | | |
| 11 | Сярод іншых сродкаў мастацкай выразнасці аўтар выкарыстаў параўнанне | | |
| 12 | Стары баярын жыў у сваім прыгожым палацы, абсаджаным стагадовымі ліпамі | | |

**Заданне 9.** Пазнайце пісьменнікаў на партрэтах і падпішыце іх, з пераліку твораў выберыце тыя, якія належаць канкрэтна гэтаму пісьменніку або не належаць нікому з прадстаўленых тут пісьменнікаў. Упішыце нумары твораў у адпаведныя ячэйкі.

*Максімальная колькасць балаў – **6.***

**Пералік твораў:**

1. “Memento mori”
2. “Над брацкай магілай”
3. “Непаўторная вясна”
4. “Подых навальніцы”
5. “Загадка”
6. “На пыльнай дарозе”
7. “Трохі пра вечнае”
8. “Мая Бесядзь”
9. “Людзі на балоце”



Гэта ______________________________

Ён аўтар наступных твораў: __________



Гэта ______________________________

Ён аўтар наступных твораў: __________



Гэта _____________________________

Ён аўтар наступных твораў: __________

?

Гэтыя творы не належаць ніводнаму з прадстаўленых на партрэтах пісьменнікаў: _______________________

**Заданне 10.** У 2024 годзе мінула 85 гадоў з таго дня, як была надрукавана адна з найлепшых беларускіх камедый, у якой супрацьпастаўлена разумная праўда і хлуслівая сіла. Сутнасць гэтай сілы аўтар выразіў трапным выразам – “свінтус грандыёзус”. Пісьменнік вядомы як стваральнік не толькі драматургічных твораў, але і баек, фельетонаў. Здагадайцеся, пра які твор ідзе размова і хто яго аўтар.

Уявіце сабе, што вы прымаеце ўдзел у стварэнні трэйлера да фільма па гэтай камедыі. Ваша задача – адабраць тры найбольш яркія эпізоды (павінны быць у тэксце твора), якія будуць уключаны ў трэйлер, патлумачыць свой выбар і напісаць закадравы тэкст (да 200 слоў). У тэксце неабходна прадставіць асноўных герояў, расказаць, пра што фільм, але пры гэтым захаваць інтрыгу. Памятайце, што тэкст пажадана звязаць з выбранымі эпізодамі.

***Для даведкі:*** *трэйлер – кароткі відэаролік, які складаецца з найбольш відовішчных фрагментаў фільма і выкарыстоўваецца для анонсу або рэкламы.*

*Максімальная колькасць балаў –* ***6****.*

Фільм будзе здымацца па п’есе “______________”, якую напісаў ________________

| Апісанне эпізоду | Тлумачэнне выбару |
|---|---|
| | |
| | |
| | |

***Закадравы тэкст***

___________________________________________________________________

___________________________________________________________________